

# Культура са знакам якасці

Плён і перспектывы галіны разгледзяць сёння на выніковай калегіі Міністэрства культуры Рэспублікі Беларусь. Знакавая для сферы падзея разгорнецца ў Нацыянальнай бібліятэцы Беларусі. Ключавым момантам пасяджэння стане выступленне профільнага міністра Анатолія Маркевіча "Культура са знакам якасці: вынікі працы і задачы галіны на 2024 год".

Да абмеркавання запланаваны і шэраг іншых тэм: "Асаблівасці і перспектывы работы па ахове гісторыка-культурнай спадчыны і ўмацаванні матэрыяльна-тэхнічнай базы галіны", "Фарміраванне сацыякультурнай прасторы ў сучасных умовах", "Аб арганізацыі працы тэатральна-відовішчных арганізацый у новых умовах", "Аб выніках работы Нацыянальнай кінастудыі «Беларусьфільм» у 2023 годзе і планах па развіцці прадпрыемства на 2024 год", "Кропкі росту міжнароднага супрацоўніцтва ў сферы культуры. Дасягненні і перспектывы". Па завяршэнні работы калегіі найлепшых рупліўцаў сферы адзначаць узнагародамі Адміністрацыі Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь, Нацыянальнага сходу, Урада і Міністэрства культуры. Падрабязнасці — у наступным нумары.

9 771994 478007 24007

KULTURA-INFO.BY